# КАБ УСЛАВІЦЬ РОДНАЕ СЛОВА

## СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ НА СЛОНІМШЧЫНЕ

«Слонімшчына літаратурная» – пад такой назвай 21 лютага ў Міжнародны дзень роднай мовы адбылася сустрэча ў дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 2 г. Слоніма». У госці да школьнікаў завіталі члены літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса, створанага пры газеце «Слонімскі веснік»: Ірына Войтка, Алена Руж, Надзея Салейка, Мікола Емельянчук, Тамара Пяцеліна, каб уславіць роднае беларускае слова, яго прыгажосць і мілагучнасць. У Год малой радзімы з вуснаў паэтаў гучалі творы прысвечаныя роднай Слонімшчыне, яе непаўторным краявідам, рацэ Шчары, роднаму гораду з яго велічавай даўнінай, непаўторнаму паланезу, які гучыць над цэнтральным скверам.

Кіраўнік літаб'яднання **Ірына Войтка** расказала пра гісторыю яго стварэння, пра паэтаў, якія жылі раней і жывуць цяпер у горадзе, прачытала свае вершы прысвечаныя роднай мове. **Алена Руж** піша на рускай і беларускай мовах: творы яе змястоўныя, напоўненыя роздумам над жыццём і падзеямі ў ім; на яе выступленні заўсёды з задавальненнем прыходзяць школьнікі. **Надзея Пятроўна Салейка** – вядомая за межамі Беларусі і Расіі керамістка, яшчэ піша не толькі сур'ёзныя вершы, але і жартоўныя, што і прадэманстравала вучням. А яе музычны твор, прысвечаны Беларусі, прагучаў у аўтарскім выкананні ў гэты дзень з асаблівай выразнасцю. **Тамара Пяцеліна** прысвяціла жыцццё Беларусі, прыехаўшы сюды з мужам у ваенны гарадок з далёкай расійскай глыбінкі. Беларусь стала для яе другой радзімай, яна ўслаўляе ў сваіх вершах родны Слонім, хараство беларускай прыроды. Сатырык і лірык **Мікола Емельянчук** прачытаў жартоўныя вершы, падзяліўся сваімі ўспамінамі пра вучобу ў гэтай школе. Вучні задавалі пытанні пісьменнікам. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Галіна Іванаўна Амелькові падзякавала ўсім прысутным за свята, якое адбылося ў гэты дзень. Атмасферу сустрэчы вызначаў асаблівы настрой роздуму, хвалявання і разумення значнасці роднай мовы ў жыцці кожнага чалавека.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На здымках:** школьнікі і пісьменнікі Слоніма. Сустрэча 21 лютага 2018 года, у Сусветны Дзень роднай мовы






Слонімскае
літаратурнае
аб'яднанне
імя Анатоля Іверса


Святло роднага слова
Жыццё класа



